12+

Просто хорошая газета

Отдушина

Основана 18 октября 2002 года

№9 (704) 28 февраля 2018 года

Издатель УП «Газета Слонимская»

Выходит один раз в неделю

ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА

У Слоніме выбралі супердзядулю



Валянцін Ляшкевіч



Уладзімір Лабко



Васіль Конеў



Аляксандр Валчан

Ганаровае званне «Супердзядуля-2018» атрымаў Уладзімір Лабко ў спаборніцтве, якое праходзіла падчас пасяджэння клуба старэйшага пакалення «Надзея». Удзел у конкурсе прымалі чатыры слонімцы, якім ужо за 75 гадоў — Аляксандр Валчан, Уладзімір Лабко, Васіль Конеў, Валянцін Ляшкевіч.

Здаецца, гэта было ўчора,
Як я хацеў стаць дырыжорам.
Мой лёс лічыў, што шлях адзіны —
Ісці мне толькі ў медыцыну,
І я таксама так лічыў,
Працяглы час людзей лячыў.
Ды з большым годам усё болей,
Я працаваць хацеў у школе.
Таму змяніў жыцця дарогу,
Стаў, як вядома, педагогам —

так пачаў сваю прэзентацыю пераможца конкурсу Уладзімір Лабко. Ён таксама расказаў, што малюе, піша вершы і спявае.

Варта адзначыць, што Уладзімір Канстанцінавіч — дзядуля пецярых унукаў, ёсць у яго ўжо і праўнукі.

На пытанне, чаму ён вырашыў прыняць удзел у конкурсе, Уладзімір Лабко адказаў, што ў самадзейнасці ён семдзесят гадоў.

— Першы раз я выступіў на Новы год у 1948 годзе і з той пары не магу жыць без сцэны, без удзелу ў розных мерапрыемствах. Калі мне прапанавалі прыняць удзел, я спачатку быў не вельмі рады, бо гэта хваляванні, а ўзрост ужо ж не той. Потым вырашыў згадзіцца. Гэтым самым хачу актывізаваць усіх людзей і пераканаць іх, што нічога ў гэтым страшнага няма нават у такім узросце, — распавёў мужчына.

80-гадовы Аляксандр Валчан паведаміў, што ён захапляецца спортам, музыкай. У дзядулі ўжо 14 унукаў. Мужчына прадэманстраваў журы, як ён можа катацца на роліках пад музыку французскага вальсу.

Былы вайсковец, маёр у адстаўцы Валянцін Ляшкевіч пра сябе і сваё жыццё распавёў у вершы і паказаў у фотаздымках.

85-гадовы Васіль Конеў у сваёй прэзентацыі паведаміў, што 50 гадоў ён займаецца самадзейнасцю, і прадэманстраваў гэта ў песні.

Творчасць канкурсантаў, эрудыцыю, умелыя рукі, слых і многае іншае ацэньвала журы.

Яно падвяло вынікі. У намінацыі «Самы гумарны дзядуля» перамог Аляксандр Валчан, у намінацыі «Самы спартыўны» — Валянцін Ляшкевіч, Васіль Конеў стаў пераможцам у намінацыі «Самы сапраўдны палкоўнік».

Таццяна ПЛАХЕТКА
ФОТА АЎТАРА




ГЭТЫ ТЫДЗЕНЬ У ГІСТОРЫІ СЛОНІМШЧЫНЫ:
26 лютага — 4 сакавіка

1 САКАВІКА 1925 ГОДА ў вёсцы Чамяры ўлады склікалі сход вяскоўцаў з мэтаю пераводу ўсіх дзяцей з беларускай на польскую мову навучання пад пагрозаю штрафу. Пасля адмовы чамяроўцаў беларускую школу зачынілі прымусова.

1 САКАВІКА 1943 ГОДА ў вёсцы Какошчыцы нарадзіўся Аркадзь Валадось, беларускі і французскі оперны спявак. Быў барытонам Марыінскага театра Санкт-Пецярбурга. Жыве ў Парыжы, дзе заснаваў асацыяцыю «Абмен: Францыя-Беларусь». У лістападзе 2017 года яму быў уручаны медаль Францыска Скарыны за асабісты ўнёсак у распаўсюджванне беларускай культуры за мяжой і ўмацаванне культурных сувязей паміж Рэспублікай Беларусь і Французскай Рэспублікай.

4 САКАВІКА 1940 ГОДА ў Слоніме пачаліся заняткі ў школе медсясцёр, фактычным папярэдніку Слонімскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа. Школа размяшчалася ў цяпер не існуючым будынку часоў гетмана Агінскага на Замчышчы.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК



ПУ «Слонимгаз» НАПОМИНАЕТ!

ГРОДНООБЛГАЗ

Уважаемые абоненты! В зимнее время не реже одного раза в месяц, а также в период резкого понижения температуры наружного воздуха собственники жилых домов должны проводить осмотр оголовков дымовых каналов в целях предотвращения их обмерзания и закупорки.
Не стоит забывать, что при эксплуатации вашего газоиспользующего оборудования вы обязаны проверить наличие тяги в дымовых и вентиляционных каналах.

Администрация ПУ «Слонимгаз»



Конкурс «Отличник»

Купон конкурс «Отличник» Слонімская Газета
ФИО участника
Школа, класс участника
Количество 9 и 10, полученных участником за текущую неделю
Мобильный телефон родителя(ей) для связи
+375 ( )
(26 февраля — 3 марта)
Дата учебной недели, за которую должны быть внесены оценки
Подпись родителя

1-е место — сертификат на 40 рублей на посещение кафе «Пятачок».

2-е место — сертификат на 30 рублей от магазина «Модные детки».

3-е место — сертификат на 20 рублей от магазина «Модные детки».

Все остальные условия остались прежними: собирайте хорошие оценки, вписывайте их в купоны конкурса и присылайте или приносите нам (231800, г. Слоним, ул. Красноармейская, 41)!

ВЫБОРЫ

Экс-кандидат в депутаты Алесь Масюк обратился с жалобой в прокуратуру



Избирательная комиссия во время голосования

НАЧАЛО НА СТР. 2

Всего по Западному избирательному округу №15 в голосовании приняло участие 379 избирателей, за провластного кандидата Елену Кунцевич проголосовало 135 человек, за Алеся Масюка проголосовало 106 человек, против всех проголосовал 21 человек, недействительных — 11 бюллетеней, испорченных бюллетеней не было.

Проведя несложные арифметические подсчеты 135+106+21+11, мы получаем, что всего проголосовало 273 человека, а не 379 человек, как указано. Получается, что неизвестно куда пропало 106 голосов избирателей. И только спустя день мы узнаём, куда делись эти 106 голосов. Официальные итоги кто-то переделал, и оказалось, что теперь против всех кандидатов проголосовал не 21 человек, а целых 127 человек. Вот такие чудеса происходят у нас на выборах, на которых депутатов избирают не люди, а те, кто подсчитывает голоса.

В связи с многочисленными нарушениями избирательного законодательства Алесь Масюк просит прокуратуру провести проверку изложенных обстоятельств. И при наличии признаков преступления (подлога протокола либо иного искажения результатов голосования) возбудить уголовное дело по статье 192 Уголовного кодекса «Нарушение законодательства о выборах, референдуме, об отзыве депутата и о реализации права законодательной инициативы граждан».

Экс-кандидат в депутаты Алесь Масюк подал жалобу и в Центральную избирательную комиссию в связи с грубыми нарушениями избирательного законодательства, повлекшими искажение результатов голосования. Поэтому он просит признать результаты подсчетов голосов по Западному избирательному округу №15 в городе Слониме недействительными.

Анна ВОЛОДАЩУК
ANNA@GS.BY
ФОТО АВТОРА

Мнение слонимчан

Свое мнение о прошедших выборах высказали слонимчане, которых корреспондент «ГС» опросила на улицах города.

Ирина, учащаяся медколледжа:

— Честно говоря, я даже не знала, за кого отдавать свой голос, поэтому проголосовала против всех. Мне не хватило агитационной информации. А почему другие люди не предпочли альтернативных кандидатов, видимо, они не хотят

ТОП-5 СЛ ДЭПУТАТ

«ГС» прааналізавала, хто з дэп (працэнт ад агульнай колькасц

1 МЕСЦА
Сяргей Федасюк — 97%
намеснік камандзіра вайсковай ч 1970 года нараджэння
участак №18, Вайсковая акруга

3 МЕСЦА
Дзмітрый Блізнюк — 93%
дырэктар Новадзявяткавіцкай ся школы, 1971 года нараджэння
участак №32, Новадзявяткавіцка

5 МЕСЦА
Уладзімір Апановіч — 89%
дырэктар КСУП «Імя Суворава», 1981 года нараджэння

Найменш галасоў набралі дэпутат ках, дзе была альтэрнатыва:

загадчыца жаночай кансультацыі цэвіч — 36% ад усіх прагаласаваўшы ку №15 Заходняй акрузе, дзе балатав Масюк;

дырэктар цэнтра банкаўскіх паслу ларусбанка Алена Кароль — 39% ад ласаваўшых на ўчастку №7 Брэсцкай балатаваўся Міхаіл Сошка;

намеснік начальніка філіяла «С

Что читает молодежь?

Взрослые постоянно говорят: «Дети проводят всё свободное время со смартфоном или за компьютером, а книг не читают». Но утверждение о том, что дети ничего не читают, не более чем миф. Мы решили узнать, с каких книг школьники начинают своё путешествие в мир «большой» литературы.

Лиза, ученица 10-го класса:



— Мне очень нравится книга Джеймса Дэшнера «Бегущий в лабиринте». По ней сняли фильм, но книга мне понравилась больше. А ещё меня очень впечатляют стихи белорусских классиков. Например, стихотворение Якуба Коласа «О, край родны, край прыгожы!» или «Мой родны кут, як ты мне мілы!».

Маргарита, ученица 8-го класса:



— Я читаю только белорусскую классику. Одним из моих любимых писателей является Василь Быков. У него достаточно много интересных произведений, которые мне по душе, например «Альпійская балада». Однако больше всего меня впечатлила книга Василя Быкова «Дажыць да світання».

Елизавета, ученица 9-го класса:



— Увлекаюсь английской литературой. Одно из последних произведений, которое я прочитала, самая известная и трагическая повесть Шекспира о Ромео и Джульетте. Безучастной я не осталась.

Кристина СОЛОДУХО
ФОТО АВТОРА

ничего менять.

Александр:

— Всем известно, что оппозиционных кандидатов не допускают в депутаты. Лично я знаю Виктора Марчика, который баллотировался в депутаты. Он хороший человек, думаю, что многие избиратели за него голосовали, но его не пропустили. Я знаю, что у нас на работе каждый второй не ходил на выборы. А посещаемость какая была, откуда они набрали эти голоса? Лично я вычеркнул всех.

Дмитрий, ученик, 16 лет:

— У нас в стране выбирают не люди, а те, кто сидит в верхах. Все фиктивно.

Анатолий Степанович, пенсионер:

— Сам я живу в Чемерах, поэтому отдал голос местному кандидату. Агитации не было никакой. Я видел всего пару фотографий. Более того, должна быть какая-то альтернатива, а не один человек баллотируется. Ранее обычно бюллетени кандидатов с биографиями вывешивали на магазине, а сейчас не было. Получается, что все делалось втемную.

Вот Сопикова уже второй срок сидит в депутатах, а что хорошего она сделала для Слонима? Депутатов просто назначают, поэтому они работают для галочки. Только деньги на эти выборы выбрасывают.

Супруги Евгений и Ольга:

— Конечно, люди должны выбирать человека, который будет работать для них. Ведь сейчас сложно выживать, крутимся с утра до ночи. Посмотрите, какие у меня руки: автомобили ремонтирую.

Ольга:

— Я пока нахожусь в декретном отпуске не знаю даже, кто выдвигался в депутаты. Куда выходить на работу, не знаю, жилья нет, у нас трое детей, десять лет стоим на очереди. Как можем выживаем.

Александр Васильевич:

— На этих выборах не было достойных кандидатов. Я ходил на выборы, но никому не отдал свой голос. И прошлый раз ходил на парламентские выборы, но за Сопикову не голосовал. И спросите, кто за нее голосовал. Но она стала депутатом. И все говорят, что надо что-то менять, а оно всё как было, так и есть и так будет продолжаться.

Анна ВОЛОДАЩУК
ANNA@GS.BY

...ЛОНІМСКІХ ...АЎ

...путатаў атрымаў найбольшую колькасць галасоў «за» ...ці тых, хто прагаласаваў на тым ці іншым участку).

...насці,

2 МЕСЦА

Алег Таргонскі — 95%

старшыня Слонімскага райвыканкама, 1962 года нараджэння

участак №28, Паўлаўская акруга

...рэдняй

...я акруга

4 МЕСЦА

Юрый Балкунец — 90%

начальнік Слонімскага раёна электрычных сетак, 1966 года нараджэння

участак №6, Тапалёвая акруга

Ігар Бялоў — 90%

начальнік Слонімскага занальнага вузла электрасувязі «Белтэлекам», 1974 года нараджэння

участак №31, Жыровіцкая акруга

...ы на ўчаст-

...Алена Кун-
...х на ўчаст-
...аўся Алесь

...уг №422 Бе-
...усіх прага-
... акругі, дзе

...лонімскае

ўпраўленне магістральных газаправодаў» ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь» Аляксей Лысуха — 40% ад усіх прагаласаваўшых на ўчастку №13 Сонечнай акругі, дзе балатаваўся Ігар Свірэпік.

Дэпутат-старажыл, які з`яўляўся дэпутатам Савета 26-га, 27-га і цяперашняга 28-га скліканняў, прэс-сакратар Навагрудскай епархіі Васіль Афанасік знайшоў падтрымку сярод 82% сваіх выбаршчыкаў (у 2010 годзе свае галасы яму аддалі 80%).

Жанна ІВАНОВА

ТРОХ НАРОДНЫХ ВЫБРАННІКАЎ АСУДЗІЛІ

Як змяняўся склад Слонімскага Савета дэпутатаў з 2010 года

«ГС» прааналізавала статыстыку па выніках выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў у 2010, 2014 і 2018 гадах. Высветлілася, што супраць некаторых народных выбраннікаў былі распачаты крымінальныя справы, 3 з якіх дайшлі да суда. Асаблівых змен у дэпутацкім корпусе за гэтыя гады не адбылося — ні ў складзе паводле сацыяльнага статусу, ні паводле ўзросту. Хіба што дэпутацкія мандаты стала больш атрымліваць слонімскіх жанчын.

Некаторыя факты з нашага падсумавання назіранняў

Усе дэпутаты мясцовых Саветаў 27-га і 28-га скліканняў беспартыйныя, толькі сярод дэпутатаў Саветаў 26-га склікання прысутнічалі 2 прадстаўнікі Аграрнай партыі.

З кожнымі выбарамі расце колькасць жанчын-дэпутатак. У 2010 годзе дэпутатамі сталі 6 жанчын, у 2014 годзе — 9, сёлета — 13.

Склад дэпутатаў паводле іх сацыяльнага статусу за апошнія восем гадоў практычна не змяніўся: амаль 90% з іх кіруюць намі — дырэктары, начальнікі ды іх намеснікі.

Больш за трэць дэпутатаў — гэта кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў.

У складзе мясцовых Саветаў трох скліканняў прысутнічаў толькі 1 рабочы — кладаўшчык ДЭП ГУП ЖКГ Аляксандр Высоцкі быў дэпутатам Саветаў 27-га склікання, ён жа, ужо майстар гэтага прадпрыемства, стаў і дэпутатам Саветаў 28-га склікання.

Сярэдні ўзрост дэпутатаў быў такі: 2010 год — 47,2 года, 2014-ы — 49 гадоў, 2018-ы — 48,6 года.

Самым маладым народным выбраннікам быў першы сакратар раённага камітэта БРСМ Андрэй Лагуцік, якому на момант выбрання ў дэпутаты ў 2014 годзе было 24 гады.

Самым узроставым апынуўся дэпутат Савета дэпутатаў 27-га склікання Уладзімір Пастэрнак, інжынер «Слонімміжрайгазу», якому на момант выбрання ў 2014 годзе было 67 гадоў.

Адзін слонімец абіраўся ў Савет тры разы — гэта



Васіль Афанасік, спачатку намеснік галоўнага рэдактара «Слонімскі веснік», пасля яе галоўны рэдактар і цяпер прэс-сакратар Навагрудскай епархіі.

14 чалавек, больш за трэць, былі двойчы дэпутатамі — 26-га і 27-га склікання.

13 чалавек, больш за трэць, былі дэпутатамі 27-га і 28-га скліканняў.

22 тысячы рублёў — такі сярэдні гадавы даход дэпутата ў мінулым годзе.

Супраць некаторых слонімцаў, якія ў свой час абіраліся дэпутатамі, былі ўзбуджаны крымінальныя справы, справы 3 з іх дайшлі да суда — дырэктара Слонімскай КПФ Валянціны Вянскоўскай, дырэктара Слонімскага ЖРЭА Мікалая Сыантовіча і дырэктара ААТ «Сянькоўшчына» Аляксандра Аўсейца.

Жанна ІВАНОВА
ІНФАГРАФІКА АЎТАРА

ВОЙДИ В ИСТОРИЮ СВОЕГО ГОРОДА

В жизни каждого человека случаются как радостные, так и горестные события. Ведь именно из них и складывается хроника нашей жизни, которая может быть интересна не только нам, но и нашим потомкам. Поэтому давайте вместе создавать историю нашего Слонима.

Если вы хотите, чтобы издание «Отдушина» написало о вашей свадьбе, рождении ребенка, известило о смерти ближнего и напечатало некролог под рубрикой "Войди в историю своего города", пишите нам -по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, Тел.: 612-26-43, 2-90-00 (Тел/факс) .

Алла Шимчак: «Я всю свою жизнь посвятила детям»

Алла Шимчак мечтала о счастливой семейной жизни. И она счастлива по-своему, невзирая на то, что с 35 лет живет без мужа. Надежной мужской опорой в жизни для нее стали ее дети. Им эта женщина посвятила всю свою жизнь. Дети — это и есть ее семья.

Все детство и юность Аллы Шимчак прошли в Минской области, в деревне Быстрица Копыльского района. После окончания средней школы она поступила в Минский аграрно-технический институт, где встретила свою вторую половинку. Молодой человек, Валентин, был родом из Слонима. Все было замечательно, они родили двоих сыновей, и она никогда не могла себе даже представить, что ее счастье однажды может разрушиться.

— В деревне прошло все мое счастливое детство и юность. После школы я поступила в институт. На третьем курсе вышла замуж за самого лучшего студента, который никак не мог дотянуть до окончания учебного заведения и сделал мне предложение. Ведь в институте был в основном мужской контингент, было много конкурентов, — начала свой рассказ Алла Анатольевна.

После окончания института она вернулась работать в родную деревню.

— Все было замечательно: я — самая, он — самый, самый лучший. Но через некоторое время в колхоз прислали еще одного студента по распределению. Мы не стали конкурировать с ним и уехали. Мужа пригласили работать в Старые Дороги, где большая часть нашей жизни прошла. Там дети в детский сад ходили, очень много было хороших друзей.

Муж был активный, деловой, практичный, как будто полжизни прожил. А я была девочка с бантиками, все видела в розовом цвете. Я всегда давала мужу зеленый свет, а сама занималась детьми и домом и считаю, что правильно делала.

Супруг в Старых Дорогах был секретарем партийной организации, потом в райисполкоме возглавлял профсоюз.

У нас подрастало двое сыновей — Алексей и Павел. А потом так случилось, что умерла моя сестра, поэтому пришлось забрать на воспитание ее дочь Наталью, которой в то время не было и семи лет.

Вскоре мы переехали жить в Слоним. Я устроилась на работу в отдел образования Слонимского райисполкома инженером по охране труда. Когда район объединяли с городом, я попала под сокращение. Время было тяжелое. Пришлось мне походить в монастырь в Лобазовке. Я осталась одна с детьми, думала о том, как их прокормить. За работу в монастыре платили три рубля в день. Шла с работы, покупала хлеб, молоко и упаковку фарша.

Затем устроилась в совхоз «Победитель» — и не пожалела, хотя изначально были сомнения: добираться надо было каждый день на работу за город.

— В то время совхоз «Победитель» был на хорошем счету?

— Да, когда был директор Владимир Кемежук, то хозяйство было в числе лучших, но мне с ним не довелось работать. Я трудоустроилась позже и проработала там семь лет. За это время я пережила 12 руководителей. Это целая история. Каждый из руководителей преследовал одну цель — обогатиться, хотя иногда в хозяйстве не за что было даже бумаги купить. Коллективу было сложно: не успеешь привыкнуть к одному начальнику, приходит новый руководитель, начинает с новой силой давить, требовать... Не успеет он прижиться, или его выгоняют, или он сам уходит, и так почти через каждые полгода новый начальник.

Правда, один пришел, посмотрел, в какой яме хозяйство находится, из которой без троса сам не выберешься, и сказал: «Хоть кладите голову на плаху, но я больше работать здесь не буду». А остальные шли, чтобы обогатиться. Зарплату себе начисляли, квартиры покупали и т.д.

— Как Вы думаете, что надо сделать, чтобы ситуация изменилась?

— Надо назначить такого руководителя, который бы захотел что-то изменить, который подобрал бы себе хорошую команду, чтобы у него была цель — поднять хозяйство. И есть в Беларуси положительные примеры, где худшие предприятия поднимали люди, которым была не безразлична их судьба.

— Алла Анатольевна, а были ли у Вас светлые моменты в жизни, которые греют душу?

— Приятные моменты — это вся моя жизнь. Мне каждый день, прожитый с детьми, приносил радость. Я всю жизнь им посвятила и ни одного дня не прожила для себя. С 35 лет я осталась одна, но никаких знакомств и романов не заводила. Никогда не боялась никаких трудностей. Но у моих детей есть серьезные проблемы со здоровьем. Это тяжело для меня. Правда, у меня хозяйство, так что скучать некогда, вся в работе.

— О чем мечтаете?

— Я об одном мечтаю — видеть счастливые глаза своих детей. Дети у меня талантливые, они меня всегда поддерживали, я получала от них всегда уважение и поддержку.

— Что помогало Вам преодолевать трудности?

— Любовь и ответственность за детей. Честно говоря, когда я осталась одна, мне не хотелось жить. Я не понимала, почему люди улыбаются, почему им весело, а дети мне заглядывали в глаза. Однажды одна ситуация вернула меня к жизни. Дети, им тогда было одному семь лет, а другому девять, две недели не сдавали деньги на обеды, откладывая мне на подарок ко дню рождения. Купили торт и огромный букет цветов. Пришли ко мне, подняли вверх торт и цветы, за которыми были видны лишь их головы, и стали меня поздравлять. У меня покатились слезы. У них на лицах было такое выражение, что они все смогут, только ты, мама, не переживай. И у меня покатились слезы надежды, что я не пропаду. Я сказала себе, что я не имею права поддаваться слабости. Подошла к зеркалу и ударила себя по лицу, сказав: «Что ты делаешь, Алла, ты должна жить ради детей!»

Мне соседи говорили: «Молодец женщина, сама идет, не сбиваясь с дороги, и дети следом идут за ней».

Анна ВОЛОДАЩУК
ANNA@GS.BY
ФОТО АФТОРА



Алла Шимчак

Воспоминание похоже на дерево: коренится во времени и растёт вместе с ним, становится всё больше и пышнее.

Йоханнес Йенсен



Пазнай сябе на фота

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-000, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30.



Лета 1998 года. Будаўнікі Спаса–Праабражэнскага сабора ў Слоніме



На фотаздымку, надрукаваным у мінулым нумары газеты («Аддушына» №8 ад 21.02.18), работнікаў Слонімскага маторарамонтнага завода, удзельнікаў першамайскай дэманстрацыі ў Слоніме 1986 года, першай пазнала жыхарка Слоніма Вольга Шмат.

— Першы злева стаіць мужчына Маркевіч, мы яго заўсёды называлі Сцяпанавіч, то імя не ўспомню ўжо. Далей — Таццяна Зорына з дачкой Вольгай. Другая жанчына — Ефрасіння Шнэк, за ёй стаіць Вера Журовіч, наступная — Святлана Ламека з дачкой Таццянай, за імі выглядае Марыя Мацвееўна Панашчык, наш былы галоўны бухгалтар, за ёй стаяць Надзея Цярохіна і Лідзія Чэмярко, — расказала Вольга Іванаўна і дадала, што з 1 студзеня гэтага года маторарамонтны завод называецца ААТ «Слонімскі рамонтны завод».

Сваю родную цётку пазнала на гэтым здымку сланімчанка Антаніна Музычка.

— Якраз у цэнтры здымка са сваёй дачкой Таняй стаіць мая родная цётка Святлана Аляксандраўна Ламека, — расказала Антаніна Рыгораўна.

Лідзія Уласік (у дзявоцтве Журовіч) пазнала на здымку сваю маці Веру Аляксандраўну Журовіч. Пра гэта жанчына напісала ў групе «Газеты Слонімскай» у «Аднакласніках».

Яшчэ адна карыстальніца гэтай сацсеткі, Алена Грэбень (у дзявоцтве Журовіч), пазнала сваю маці Веру Журовіч, а таксама Ефрасіннюю Шнэк і Надзею Цярохіну.

Наша распаўсюдніца газет Галіна Рак пазнала Лідзію Чэмярко, Надзею Цярохіну, Святлану Ламека і Ефрасіннюю Шнэк.

Яшчэ адна распаўсюдніца «Газеты Слонімскай», Ніна Рыжова, таксама пазнала Ефрасіннюю Шнэк, якая жыве з ёй побач у ваенным гарадку.

Пазнаў сябе на гэтым фотаздымку слонімец Іван Бабяк.

— Купіў газету, адкрываю сёмую старонку «Аддушыны» — і бачу сябе пад рубрыкай «Пазнай сябе на фота». Я там стаю крайні злева з транспарантам. На той час, у 1986 годзе, я працаваў галоўным інжынерам упраўлення капітальнага будаўніцтва Слонімскага райвыканкама, — расказаў Іван Іванавіч.

Мікола КАНАНОВІЧ

ФОТА З АРХІВА «ГС»

СЛОНИМЧАНЕ — ЖЕРТВЫ ПОЛИТИЧЕСКИХ РЕПРЕССИЙ В 30-Е ГОДЫ

НАЧАЛО В №№2-8

Адах Летка (Леокадия) Игнатьевна

1934 г.р., м.р.: Барановичская обл., Слонимский р-н, Заводный Лес, гражданка Польши, полька, дочь осадника. Обвинение: осадник.

Приговор: 10.02.1940 — Выселена. 28.02.1940 прибыла на спецпоселение: Вологодская обл., Тотемский р-н, Крутая Осыпь. Осв. 01.09.1941 по Указу ПВС СССР «Об амнистии польских граждан».

Адах Регина Игнатьевна

1930 г.р., м.р.: Барановичская обл., Слонимский р-н, Заводный Лес, гражданка Польши, полька, дочь осадника. Обвинение: осадник.

Приговор: 10.02.1940 — Выселена. 28.02.1940 прибыла на спецпоселение: Вологодская обл., Тотемский р-н, Крутая Осыпь. Осв. 01.09.1941 по Указу ПВС СССР «Об амнистии польских граждан».

Адах Станислав Игнатьевич

1932 г.р., м.р.: Барановичская обл., Слонимский р-н, Заводный Лес, гражданин Польши, поляк, сын осадника. Обвинение: осадник.

Приговор: 10.02.1940 — Выселен. 28.02.1940 прибыл на спецпоселение: Вологодская обл., Тотемский р-н, Крутая Осыпь. Осв. 01.09.1941 по Указу ПВС СССР «Об амнистии польских граждан».

Адах Тадеуш Игнатьевич

1937 г.р., м.р.: Барановичская обл., Слонимский р-н, Заводный Лес, гражданин Польши, поляк, сын осадника. Обвинение: осадник.

Приговор: 10.02.1940 — Выселен. 28.02.1940 прибыл на спецпоселение: Вологодская обл., Тотемский р-н, Крутая Осыпь, 05.10.1940 умер на спецпоселении, место захоронения: пос. Крутая Осыпь Тотемского района Вологодской обл.

Адах Юзеф Игнатьевич

1938 г.р., м.р.: Барановичская обл., Слонимский р-н, Заводный Лес, гражданин Польши, поляк, сын осадника. Обвинение: осадник.

Приговор: 10.02.1940 — Выселен. 28.02.1940 прибыл на спецпоселение: Вологодская обл., Тотемский р-н, Крутая Осыпь. Осв. 01.09.1941 по Указу ПВС СССР «Об амнистии польских граждан»

Источник: База данных «Польские спецпереселенцы в Вологодской обл.»

Жанна ИВАНОВА

Стрэмка ў сэрцы

— Мама, тата, вы не перажывайце, Алеська ўжо самастойная, усё адно як дарослая, так што клопату з ёй вам не будзе, — суцяшала Вера бацькоў. — Восенню ў школу пойдзе, у першы клас, а лета няхай правядзе ў вас, бо мы з Максімам на мора паедзем, а потым і на работу трэба, і дачу рамантаваць...

Маленькая бялявая дзяўчынка ў ружовай сукенацы з кароткімі рукавамі калупала зялёным шкельцам пясок каля ганку і нават брывом не павяла, калі машына з бацькамі папыліла па вясковай вуліцы.

— Ну, Сцяпан, уваткнулі яны стрэмку ў маё сэрца, — горка ўздыхнула баба Казя. — Самастойная... Дарослая... — перадражніла дачку. — Ды яна і ў горадзе, як я была ў іх перад Калядамі, мяне не слухалася. Дык то ў горадзе: замкну дзверы і нідзе не дзенецца, а тут паспрабуй упільнуй. І лес побач, і сажалка, хоць за нагу яе прывязвай, не раўнуючы як курыцу-квактуху.

— Чаго ты бядуеш, упільнуем, абое ж на пенсіі.

Алеська нахмурыла светлыя бровы і пазірала з-пад лобіка на старых:

— Як захачу, то і не ўпільнуеце, пільнавальшчыкі такія. Я хутка бегаю, а вы ледзь калываецеся...

— Во, чуў?! — ажно прысела Казя. — І дзяцей тут няма, каб з кім пагуляла, адна будзе бэрсацца.

Алеська кінула зялёнае шкельца і села на ганак каля дзеда, які зашываў дратвай бабін тапак.

— А чаму яблыня з чырвонымі яблычкамі, што за вуліцай, сібіркай называецца? Га, дзед? Сцяпан, лысы, сутулы, трымаў у роце дратву і шылам стараўся прапароць дзірку ў тапку. Нешта прагугнявіў у адказ.

— Што ты мыкаеш, скажы талкова!

— Бачыш, дзед заняты, не перашкаджай, — мовіла Казя.

— А я хачу ведаць!

— Некалі ён ездзіў будаваць БАМ і адтуль прывёз жменю яблычных зярнят. Вось з аднаго і вырасла яблыня. Як яна правільна называецца — не ведаем, але кажам сібірка.

— А дзе той бам?

— Далёка...

— Бам-бум, бам-бум! — скакала Алеська на адной назе. Яна пакруцілася па надворку, а потым збегала ў хату і ўзяла кавалак батона. Баба якраз крышыла свінням бурачнік і за ёй не назірала. Маленькая паціху адчыніла брамку ў агарод, потым прашмыгнула на дарожку, якая вяла да лесу, што быў непадалёку. Яна хацела пакарміць птушак.

— У заапарку-то вас кормяць, а ў лесе няма каму, — разважала. — Я кожны дзень буду насіць вам батон.

Ішла па дарожцы, спрэс усеянай бялюткімі парашуцікамі маргарытак, і крышыла батон. Дарожка павярнула ўлева, і дзяўчынка не заўважыла, як з вачэй знік бераг лесу. Спахапілася толькі тады, калі закончыўся батон. Але не павярнула назад, а ішла далей.

— Зараз праверу, ці сапраўды ў лесе жыве баба-яга, бо ўсё можа быць, — казала сама сабе.

Дзед Сцяпан закончыў сваю работу і пайшоў у хату напіцца. І баба Казя, тоўстая, як качка, усчарэпкалася на ганак.

— А дзе ж Алеська? — гукнула мужу з сяней.

— А я ведаю? Усё тут круцілася...

Яны сталі клікаць малую, шукаць ва ўсіх кутках двара, але яе нідзе не было.

— Усё, у мяне зараз сэрца спыніцца! — Казя пабялела і схапілася за грудзіну. — Можа, у лес паперлася ці ў сажалку праваліліся?!

Сцяпан хоць і меў вытрымана характар, ды таксама ўстрывожыўся не на жарты. Але супакойваў жонку:

— Не хвалюйся, выпі сардэчных кропель, а я абыду ваколіцу.

Не паспеў выйсці за вароты, як убачыў, што ад лесу едзе на ровары ляснік Міхась Лабарчык і вязе на раме іхнюю ўнучку. У ручцы дзяўчынка трымала букецік белых маргарытак.

— Во, забірайце сваю прынцэсу. Кажа, птушак карміла ў лесе. Заблудзілася і хоць каб спалохалася, заплакала, — Міхась ссадзіў малую на зямлю.

Сцяпан і Казя не спускалі з унучкі вачэй. Але хіба ўпільнуеш? Аднойчы раніцай, калі ўпраўляліся па гаспадарцы, убачылі, што Алеська стаіць на вуліцы побач з вялікім чорным сабакам. Гэты сабака бадзячы, амаль роўны з ёй. Абедзвюма рукамі гладзіла па клыкастай мордзе. Казя падбегам прывалюхала да іх і хацела схапіць малую за руку, але сабака ашчэрыўся і загырчаў.

— Бачыш, баба, ён цябе баіцца. Ідзі дадому!

Баба з дзедам ледзь адцягнулі яе ад сабакі, ледзь угаварылі.

— Нейкая ненармальная дзяўчынка расце, — з горыччу сказала Казя, калі вечарам паклала Алеську спаць. — Ніякі цацак панавозілі, то і ўвагі на іх не звяртае, а ўсё нешта выдумляе. Ужо і не ведаю, што рабіць...

— Не цікава ёй з цацкамі... А па-мойму, цудоўная дзяўчынка, дапытлівая.

Чэрвеньскім поўднем, калі баба з дзедам варочалі на абмежку мурог, Алеська бегла па вуліцы і дубчыкам барабаніла па штыкетніку. Дабегшы да хаты Мані Бурачэўскай, убачыла, што гаспадыня ляжыць каля хлява, а побач вядро, з якога толькі што выліўся сырадой. Алеська зразумела: бабулі дрэнна. Хуценька забегла ў хату, убачыла на стале тэлефон і маленькім дрыготкім пальчыкам набрала нумар хуткай дапамогі:

— Прыязджайце, чужая бабуля памірае ў нашых Букатоўцах! У двары ляжыць. Хутчэй!

Вёска была ўсяго за два кіламетры ад райцэнтра, і хуткая прымчала за некалькі хвілін. Убачыўшы яе, па вуліцы ўслед беглі людзі.

Маню адратавалі.

— Дзяўчынка нам пазваніла, — сказала пажылая фельчарка. — Ты, напэўна? — зірнула на Алеську.

— Я...

— Малайчынка, каб не ты, то бабуля памерла б, а так забяром у бальніцу, палечым, і ўсё будзе добра.

— Вось табе і стрэмка ў сэрцы, — сказаў Сцяпан, калі яны з Казяй вялі маленькую дадому. — Вось табе і ненармальная... Сама ты ненармальная! — ён узяў Алеську на рукі, прытуліў да сябе і панёс у двор...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ



ПОИГРАЕМ В НОЧНЫЕ ИГРЫ?

В Слонимском центре культуры продолжается показ нового комедийного детектива «Ночные игры».

События картины занимают всего одну ночь. Энни и Макс развлекаются тем, что участвуют вместе с несколькими другими парами в ночных ролевых играх детективного характера. В очередной постановке Брукса и его друга похитили загадочные агенты. Похищенных убьют, если их не найдут вовремя.

Шестеро игроков неожиданно для себя оказываются вовлечены в по-настоящему опасную для жизни историю...

Никита ПАСТУХОВ

N.PASTYHOW@GMAIL.COM



АФИША

Театр

4 МАРТА, ВОСКРЕСЕНЬЕ

Для детей: «Мяфа», начало в 12.00

Центр культуры и отдыха

Кинозал

28 ФЕВРАЛЯ, СРЕДА

«Мухнём на Луну» 3D (Перу, 2017, 6+, мультфильм, 1 ч. 28 мин.), начало в 12.00, 13.30

«Чёрная пантера» 3D (США, 2018, 16+, фантастика, 2 ч. 14 мин.), начало в 15.00, 19.30

«Ночные игры» 2D (США, 2018, 18+, боевик, комедия, 1 ч. 40 мин.), начало в 17.30, 21.50

1 МАРТА, ЧЕТВЕРГ

«Мэри и ведьмин цветок » 2D (Япония, 2017, 6+, мультфильм, 1 ч. 42 мин.), начало в 12.00

«Чёрная пантера» 3D, начало в 18.00

«Ночные игры» 2D, начало в 20.30

2 МАРТА, ПЯТНИЦА

«Мэри и ведьмин цветок» 2D, начало в 12.00, 14.00

«Чёрная пантера» 3D, начало в 16.00

«Ночные игры» 2D, начало в 18.30, 20.30

3 МАРТА, СУББОТА

«Мэри и ведьмин цветок» 2D, начало в 12.00, 14.00

«Чёрная пантера» 3D, начало в 16.00

«Ночные игры» 2D, начало в 18.30, 20.30

4 МАРТА, ВОСКРЕСЕНЬЕ

«Мэри и ведьмин цветок» 2D, начало в 12.00, 14.00

«Чёрная пантера» 3D, начало в 16.00

«Ночные игры» 2D, начало в 18.30, 20.30

Главный редактор Виктор Владимирович Володащук

Учредитель **Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК**

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции: МТС: 8-029-584-87-32, Velcom: 8-029-133-04-21, **факс:** 8 (01562) 2-90-00, звонить с 9.00 до 18.00, **Skype — gazslon**

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41. Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Свободная цена

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 27 февраля 2018 года 15:00

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА 8-(044) 715-90-03, 8-(044) 762-48-39, ул. Красноармейская, 73Б (здание АРЗ)

e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Объем — два условных печатных листа. Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025. Заказ № 1169

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь

ISSN 1991-3362



